ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 173 (1442) АЎТОРАК, 28 ліпеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

Фашысцкія „дзеячы" зьдзяйсьняюць пляны нападу на СССР

Заклікі і патураньні да антысавецкіх провокацый

Пад лёзунгамі абароны СССР працоўныя масы Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны організуюць баявыя выступленьні 1-га жніўня

Новыя антысавецкія выпады фашысцкага друку

Узлобленым сродкам у падрыхтоўцы вайны супроць СССР у лягеры польскага фашызму зьяўляецца кампанія паклёпаў і хлусьні на адрасу Савецкага Саюзу, якая з кожным днём узмацняецца і прымае ўсё больш і больш нахабны характар.

Польскія газэты гэтымі днямі паведамілі аб арышце і пакараньні сьмерцю майора польскага генеральнага штабу Дэмкоўскага, які абвінавачваўся ў шпіонажы.

Як і патрэбна было чакаць вакол гэтай справы ва ўсёй фашыстоўскай прэсе пачалася кампанія. Спачатку прэса сьцьвярджала, што Дэмкоўскі быў „ідэйным комуністым" потым пачала паведамляць аб тым, што ён ня быў „ідэйным комуністым", а у свой час служыў у белай арміі, але-ж справа ў „зьмене падвор'я" ў фашысцкім друку. Уся сутнасьць гэтай кампаніі зараз выкрыла свой яўны антысавецкі напрамак. Фашысцкая прэса пачала у сувязі з пакараньнем Дэмкоўскага цкаваньне савецкага поўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве за тое, што нібы Дэмкоўскі перадаваў работнікам паўпрадства вайсковыя дакументы.

Аб усёй ілжывасьці і антысавецкай мэтанакіраванасьці гэтай чарговай правакацыі даводзіць не прыходзіцца. Антысавецкі характар яе зусім відавочны і аб гэтым гавораць ня толькі зьмест выступленьняў усёй буржуазнай і фашысцкай прэсы, але-ж і тое, што выпады ад'яўляюцца ворага савецкай рэспублікі, зубра польскага фашызму—рэдактара газэты „Слова" сольны-фашыста Мацкевіча.

Мацкевіч—для нас ужо знаёмая персона. Гэта той Мацкевіч, які сваю паездку ў СССР скарыстаў яўна з антысавецкімі мэтамі.

І ваш у сваіх артыкулах ён вымушаны быў заявіць, што „у выпадку вайны польшчы (гэта значыць, у СССР) будзе зубамі і пазногцямі абараняць СССР, а контрэволюцыянеру першы сустрэчны комсамолец, або комсамолка перагрызе горла", але гэты Мацкевіч апрабуе абгрунтаваць узмацненьне антысавецкай кампаніі ў фашысцкай Польшчы. На падставе сьцьвярджэньня факту рэволюцыйнасьці пачуцьцяў моладзі Савецкага Саюзу Мацкевіч не знайшоў нічога, як прысьці да вываду аб неабходнасьці падрываць моц Савецкага Саюзу шляхам бомбавых замахаў на выдатных дзеячаў Савецкай рэспублікі.

Гэтыя свае намеры Мацкевіч упарта працягвае і далей. Ён выкарыстоўвае з антысавецкімі мэтамі і факт арышту і растрэлу майора Дэмкоўскага. Мацкевіч зараз выступае з патрабаваньнем вызваленьня Каверды—забойцы савецкага паўнамоцнага прадстаўніка ў Варшаве тав. Войкава.

Замахі на поўнамоцных прадстаўнікоў СССР, выкарыстаньне з антысавецкімі мэтамі працэсу Палінскага, рэчышча хлусьні ў фашысцкім друку супроць СССР і г. д.—усё гэта звеньні ў ланцугу антысавецкай політыкі польскага фашызму. Усе гэтыя выпады, як мы бачылі, пакрываліся ўрадавымі коламі польскага фашызму.

Сёньня як ніколі абвастраньня антысавецкай дзейнасьці польскага фашызму, мы маем усё больш часьцейшымі адкрытыя провокацыйныя антысавецкія выступленьні накшталт Мацкевічаўскіх, якія ня толькі яшчэ з большай поўнатой пацьвярджаюць усю антысавецкую політыку польскага фашызму, але-ж зьяўляюцца новымі заклікамі, адкрытымі патураньнямі да новых антысавецкіх провокацый.

Для працоўных мас Савецкага Саюзу і Савецкай Беларусі відочна ўся антысавецкая пачнаготнасьць політыкі польскага фашызму і яго верных лёкаяў—беларускіх нацыянал-фашыстых. Факты апошніх дзён зьяўляюцца новымі фактамі падрыхтоўкі антысавецкай інтэрвэнцыі. І іменна супроць гэтай антысавецкай інтэрвэнцыі ў міжнародны чырвоны дзень—1 га жніўня рабочая кляса, працоўныя масы сялянства Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны разам з рабочымі ўсяго сьвету будуць дэмонстраваць пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі свае сілы ў абарону Савецкага Саюзу.

Магутная комуністычная дэманстрацыя ў Лодзі

ВАРШАВА. 26. У Лодзі адбылася комуністычная дэманстрацыя пад лёзунгам: „Вайна імпэрыялістычнай вайне". У горадзе разьвешаны і расклеены комуністычныя адозвы. Атрады паліцыі запоўнілі вуліцы гораду, дзе былі прызначаны мітынгі. Адбылася сутычка дэманстрантаў з паліцыяй.

Рост самагубстваў у Варшаве

ВАРШАВА. 26. Паводле паведамленьня газэт, колькасьць самагубстваў у Варшаве за апошнія часы лютага значна ўзрасла. У большай частцы ўзрост тых, што робяць замахі на самагубства, ад 21 да 30 год.

Узмацняюцца рэпрэсіі супроць комуністычнага друку

БЭРЛІН. Поліцэй-прэзыдэнт забараніў комуністычныя штодзённікі „Абэрляўзіцы", орган рэволюцыйнай профопазыцыі прамысловых раёнаў Лейпцыгу, Борцен і Борна „Бесправоўцы" і яго провінцыяльныя выданьні, а таксама газэту „Ротэр Руфэр". У Макленбурзе—улады забаранілі на 4 тыдні орган компартыі Макленбургу.

Рабочыя Ангельшчыны будуць змагацца рука аб руку разам з індыйскімі рабочымі

ЛЁНДАН. 22. Агенцтва „Асошыэйтэд прэс" паведамляе, што суд у Міруце адпусьціў на парукі толькі 6 абвінавачаных па Міруцкаму працэсу. Гэтыя абвінавачаныя заявілі, што яны „не зьяўляюцца комуністымі". Шэраг іншых падсудных адкрыта і мужна прызналі сваю прыналежнасьць да комуністычнага руху. Прасад заявіў, што ён зьяўляецца членам індыйскай компартыі і што толькі праграма комуністычнага інтэрнацыяналу дасьць незалежнасьць Індыі і аслабаненьне рабочым і сялянскім масам. Другі падсудны Брэдлі заявіў, што ганарыцца прыналежнасьцю да ангельскай компартыі. „Я заяўляю, сказаў Брэдлі, — што рабочыя Ангельшчыны будуць змагацца рука аб руку разам з індыйскімі рабочымі, з нашым ворагам агульным—імпэрыялізмам. Мы не робім з гэтага ніякай патаемнасьці.

УЗДЫМ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ У ГІШПАНІІ

КРЫВАПРАЛІТНЫЯ БОЙКІ РАБОЧЫХ З ВОЙСКАМІ

Узброенае падаўленьне паўстанцаў

Мадрыд. Для падаўленьня рэволюцыйнага руху ў Сэвільлі нізка лётаюць над горадам узброеныя кулямэтамі аэропляны. На пляцох і вуліцах гораду расстаўлены кулямёты і пушкі.

У Алкала-дэ- Гвадайка (провінцыя Сэвільлі) абылася сутычка паміж рабочымі масамі і грамадзянскай гвардыяй.

У Барсэлоне пры сутычкі рабочых з поліцыяй поліцэйскі офіцэр, два поліцэйскіх агенты і некалькі рабочых паранены.

У Малазе будаўнічыя рабочыя абвясьцілі забастоўку солідарнасьці з бастуючымі гарадзкімі рабочымі і служачымі.

У Ла-Рынконада адбылася дэмонстрацыя жанчын рабочых, якія патрабавалі аслабаненьня арыштаваных комуністых і роспуску грамадзянскай гвардыі.

Папсаваны многія тэлефонныя правады. За апошнія двое сутак забіта 11 чалавек. Больніцамі зарэгістравана 145 чал. параненых.

Масія, галава Каталонскай улады, заклікае рабочых да „перамір'я". Адначасова Масія, ўлічваючы настроі мас, „протэстуе" супроць проэкту закону аб ахове рэспублікі. Урад заявіў, што ён гатоў адмовіцца ад ажыцьцяўленьня гэтага закону, але на практыцы ён праводзіць самыя рэзкія меры па „падпрыманьню парадку".

Артылерыйскі абстрэл дамоў у Сэвільлі

МАДРЫД. 25. Як паведамляюць з Сэвільлі, камандуючы войскамі увёў у раёне Сэвільлі папярэднюю цэнзуру ў друку. У Констанцыне адбылася сутычка рабочых з поліцыяй. Адзін рабочы забіты, двое паранена. Артылерыйскі абстрэл дамоў у Сэвільлі выклікаў вялікім абурэньнем насельніцтва. Забастоўка тэлеграфістых працягваецца бяз зьмены. У Мадрыдзе арыштаваны 22 забастоўшчыкі. У Фэроне перарэзаны тэлефонны провад. Двое заарыштаваны.

Прымусім прыроду раскашэліцца

Генпляя электрыфікацыі і другая бальшавіцкая пяцігодка—пяцігодка пабудовы ў асноўным соцыялізму, да складаньня якіх ужо прыступлена, будуць ствараца на падставе ўліку перамог першай пяцігодкі і прыродных багацьцяў краіны.

Беларускія нетры захоўваюць нявычарпальную колькасьць торпу, жалезнай руды, сопрапэляй, гліны, мэргелей і іншых хэмічных матар'ялаў. Аднак, мы да гэтага часу мала ведаем свае багацьці, большасьць з іх яшчэ не дасьледвана.

Гэолёга-разьведчыя організацыі БССР ня здолелі забясьпечыць такіх тэмпаў дасягненьня, якія-б адпавядалі тэмпам росту соцыялістычнага будаўніцтва.

Дрэнная пастаноўка працы гэолёга-разьведачных організацый у асноўным тлумачыцца няўвязкай працы паміж шэрагам організацый, якія займаюцца гэтай работай (гэолёгічны інтытут БАН, галоўнае гэолёгічнае разьведачнае кіраўніцтва ВСНГ СССР гэолёгічна-разьведачнае кіраўніцтва ВСНГБ і іншыя) і адсутнасьцю ўвагі да гэтай важнейшай працы з боку пролетарскай грамадзкасьці.

ЦКК--РСІ месяц таму назад асобнай пастановай вызначыла шэраг конкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць тэмпы работы гэолёга-разьведачных організацый у адпаведнасьці з тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Адным з асноўных пунктаў гэтай пастановы зьяўляецца пункт аб організацыі адзінага цэнтру беларускага гэолёга-разьведачнага кіраўніцтва пры ВСНГБ, які павінен уваходзіць у сыстэму ГГРК пры ВСНГ СССР.

Гэта пастанова ня выканана коснасьць і інэртнасьць гэолёгічных організацый не дае ім магчымасьці ператварыць у жыцьцё важнейшы політычны дакумант.

Такое становішча працы гэолёга-разьведачных організацый, бязумоўна, затрымлівае складаньне генпляну другой пяцігодкі.

Ня гледзячы на спэцыяльныя даручэньні оргкамітэту па складаньню генпляну аб падрыхтоўцы спэцыяльных матар'ялаў—апошнія ня выкананы.

Мы павінны зараз форсаванымі тэмпамі ўзяцца за складаньне пяцігодкі і генпляну, і падначаліць выкананьню гэтай задачы гэолёга-разьведачную працу.

Пролетарская грамадзкасьць павінна аказаць разьведачным організацыям вялікую дапамогу. Асаблівую ролю тут павінен адыграць шэф электрыфікацыі—комсамол.

Вывучыць багацьце кожнага раёну, прыняць удзел у рабоце разьведачных груп, вылучыць лепшых комсамольцаў на працу ў гэолёга-разьведачныя атрады—важнейшая задача комсамольскай організацыі. Нашы багацьці—гэта мінэральная і сырцовая база прамысловасьці, гэта шлях для ператварэньня Беларусі з аграрнай у індустрыяльна-калгасную.

Ведаць свае багацьці, змагацца за іх скарыстаньне—задача кожнага комсамольца, ударніка варштату поля і друку.

ПАБУДУЕМ МОЦНЫ ГРАМАДЗЯНСКІ ПАВЕТРАНЫ ФЛЁТ

КОЖНАЯ ЯЧЭЙКА ЛКСМБ АДКАЗВАЕ ЗА КАНКРЭТНУЮ РАБОТУ

На „Кастрычніку" разгортваецца работа

На фабрыцы „Кастрычнік" праведзены сход членаў АСО з рабочымі фабрыкі. Організаваны збор сродак у карысьць грамадзянскай авіяцыі. Вынесена пастанова аб організацыі суботніка на аэродроме. Даручана фабкому ўтварыць вярбоўку лепшых членаў АСО у школу грамадзянскай авіяцыі, організаваць гурток па вывучэньню тэхнікі грамадзянскай авіяцыі.

Усе рабочыя ўступілі ў шэрагі АСО. За лепшую работу ў ячэйцы АСО ўзнагароджаны граматамі ад бюро колектыву ЛКСМБ, бюро колектыву КП(б)Б і ячэйкі АСО т. т. Рубіна, Ленская, Баркан, Левін, Марсон, Мэтор, Паўтар. 25 чалавек узнагароджаны рознымі рэчамі за добрую працу ў хэматрадзе.

Хэматрад імя Варашылава на фабрыцы „Кастрычнік" уносіць на карысьць грамадзянскай авіяцыі 108 руб.

Рабочыя і работніцы фабрыкі „Кастрычнік" на карысьць грамадзянскай авіяцыі ўносяць: Ісаевіч—10 ці рублёвую аблігацыю і замацоўваецца на фабрыцы да канца пяцігодкі, Крэйбіч—5 рублёў, Траханаў—3 руб.

Апраўдваюцца прарывамі

— На Менскай абутковай фабрыцы пытаньнем дапамогі грамадзянскай авіяцыі ні фабзаўком, ні парт'ячэйка, ні колектыў ЛКСМБ не займаліся. Сэкратар колектыву ЛКСМБ апраўдвае гэта тым, што на фабрыцы вялікі прарыў прамфінпляну.

— На фабрыцы „Беларуска" таксама нічога ў гэтай галіне не робіцца. З-за адсутнасьці дакладчыка не праведзены нават гутаркі з рабочымі.

У фонд грамадзянскай авіяцыі

— Агульны сход рабочых шчотачнай фабрыкі імя Крупскай (Менск) пастанавіў адлічыць два процанты зарплаты на ўмацаваньне грамадзянскай авіяцыі. Пасьля суботніка па ўборачнай кампаніі мяркуецца правядзеньне суботніку на фабрыцы.

— Фізкультурная брыгада маляроў і брыгада сталовых вясоў заводу „Ударнік" двухгадзінны заработак аддалі на пабудову самалёту імя „8-мі"

— На заводзе імя Варашылава (Менск) адбыўся мітынг аб дэкадніку па дапамозе грамадзянскай авіяцыі. Організавана лётарэя. Сябры АСО, выходзячы з памеру зарплаты, зрабілі самаабкладаньне. Рыхтуецца суботнік на пабудову дарогі Менск-Магілеў (4-я дыстанцыя).

У гуртку па вывучэньню тэхнікі грамадзянскай авіяцыі займаецца 15 чал

— Працаўнікі Белдзяржснабу пастанавілі адлічыць 3 проц. месячнага заработку на карысьць грамадзянскай авіяцыі і адзін дзень адпрацаваць на аэродроме.

— На хлебазаводзе рабочыя адлічылі два процанты месячнага заработку ў фонд грам. авіяцыі 10 чалавек рабочай моладзі падрыхтоўваецца ў школы грамадзянскай авіяцыі. Організавана 5 гурткоў па вывучэньню прынцыпаў грамадзянскай авіяцыі.

На заводзе „Чырвоны хэмік" таксама рабочымі адлічаны 2 проц. месячнага заработку.

На фабрыцы 8-е сакавіка" рабочыя адлічылі 2-хдзённы заработак. Організавалі гурток па вывучэньню грамадзянскай авіяцыі.

— Комсамольскі дом адпачынку ў Драздох у фонд грамадзянскай авіяцыі сабраў 175 руб.

Колектывам БДВ, друкарні імя Сталіна, Белдзяржснабу, Белкоопсаюзу і Добрускай папяровай фабрыкі

ЦК ЛКСМБ прапануе вам у парадку ажыцьцяўленьня шэфства над усеабучам узяць непасрэдны кантроль:

Колектыву папяровай фабрыкі Добрушу—над сваячасовай адгрузкай паперы для друкарні імя Сталіна.

—Колектыву друкарні імя Сталіна—над сваячасовым і поўным выпускам з друку падручнікаў і праграм.

—ячэйкам БКС, БДВ і Белдзяржснабу над сваячасовым прасоўваньнем нарадаў для забясьпечаньня школ вопраткай, гарачым сьнеданьнем адзіраўкай на месцы падручнікаў і праграм.

Для лепшага правядзеньня гэтай работы, стварыць комсамольскія пасты, якія штодзённа павінны інформаваць „Чырвоную Зьмену" і ЦК ЛКСМБ аб ходзе работы па гэтых пытаньнях.

Загадчык аддзелу Адукацыі і быту ЦК ЛКСМБ Рубінчык.

Мы яшчэ бедныя ведамі сваіх багацьцяў

ГЭОЛЁГІЧНА-ДАСЬЛЕДЧУЮ ПРАЦУ НА ВЫШЫНЮ СТАЎШЫХ ЗАДАЧ СКЛАДАНЬНЯ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ І ГЕНЭРАЛЬНАГА

ДАЦЬ КАДРЫ гэолёга-разьведачным організацыям

Недахоп кадраў кваліфікаваных працаўнікоў у галіне гэолёга-разьведачных работ зьяўляецца значнай перашкодай у належным разгортваньні работ

Зараз на Беларусі працуе ўсяго сем дасьледчых партый ВСНГБ і гэолёга-разьведачнага інстытуту БАН Гэтая колькасьць дасьледчых партый, бязумоўна, ня можа забясьпечыць сваячасовую распрацоўку аграмаднай колькасьці матар'ялаў, якіх штодзень патрабуе наша прамысловасьць і якія зьяўляюцца неадрыўнай часткай складаньня другой пяцігодкі і генпляну.

Выходзячы з усёе важнасьці падрыхтоўкі кадраў, ЦКК НК РСІ пастанавіў адчыніць пры Менскім Архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме з наступнага году спэцыяльнае аддзяленьне па гэолёга-разьведачнай справе. Але шэраг організацый, ад якіх залежыць ажыцьцяўленьне гэтае надзвычайна важнае пастановы імкнецца формальна выканаць яе, фактычна сарваўшы мерапрыемства, якое павінна вырашыць проблему кадраў у гэтай галіне.

Аддзел кадраў ВСНГБ, ня ўлічваючы сапраўднага запатрабаваньня гэолёга-разьведачных работ, вызначыў лічбу набору ў 30 асоб, паменшыўшы ў два разы запатрабаваньні, якія высоўваюць цэнтральныя гэолёга-разьведачныя ўстановы.


Аддзелу кадраў ВСНГБ неабходна ўлічыць сумны вопыт працы ў напрамку падрыхтоўкі працаўнікоў па гэолёга-разьведачных работах. Організаваныя ў мінулым годзе гэолёга-разьведачныя курсы, не забясьпечаныя неабходнымі сродкамі, ня маючыя магчымасьці весьці нормальныя заняткі, на якія патрачана было шмат сродкаў давялося расформаваць.

Ужо зараз неабходна разгарнуць падрыхтоўчую працу да набору, выходзячы з мінімальнай лічбы набору ў 60 асоб.

Гэолёга разьведачны інстытут БАН, гэолёга-разьведачнае кіраўніцтва ВСНГБ і іншыя організацыі павінны прыняць захады да ўкомплектаваньня аддзяленьня, вылучыўшы лепшых рабочых.

Зараз неабходна ўзяць напрамак на больш рашучае высоўваньне ўжо спрактыкаваных, лепшых рабочых удзельнікаў гэолёга-разьведачных работ. Вопыт ГРК ВСНГБ, які вылучыў на кіраўнічую працу цэлы рад рабочых, якія сябе апраўдваюць на працы, даводзіць, што гэта—адзін з шляхоў вырашэньня проблемы кадраў.

Зусім недапушчальным зьяўляецца надзвычайна дрэннае, не рацыянальнае скарыстаньне спэцыялістых у разьведачных групах ГРК ВСНГБ, дзе яны замест непасрэднага тэхнічнага кіраўніцтва, займаюцца організацыйнымі пытаньнямі, забясьпечваньнем рабочых спэцвопраткай.



Кожны нясе свае матар...

Тэмпы работ--невыстарчальныя

(З пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Колегіі НК—РСІ БССР па абсьледваньню гэолёга-разьведачнай справы ў БССР)

Адзначыць, што недаацэнка мясцовымі і саюзнымі органамі гэолёга-разьведачнай справы ў мінулым па падрыхтоўцы мінэральнай сырцовай базы для разьвіцьця прамысловасьці і інш. галін народнай гаспадаркі БССР—конкрэтна выразілася ў наступных адмоўных момантах.

З-за адсутнічаньня адзінага кіруючага органу па гэолёга-разьведачнай справе—наглядаецца няўвязка работы паміж організацыямі, праводзячымі гэолёгічныя, гэолёга-разьведачныя і буравыя работы на тэрыторыі БССР (Гэолёгічны інстытут БАН, горнае кіраўніцтва ВСНГБ, Белдортранс, Белкомгасбуд, ГГРК, МРГРК, Вадаканалбуд і рад іншых саюзных організацый), шкодны паралелізм, самагужніцтва, не выстарчальныя тэмпы, нерацыянальнае скарыстаньне сіл і сродкаў і г. д., з прычыны чаго, каштоўныя матар'ялы па гэолёгіі, гідро-гэолёгіі БССР раскіданы па розных організацыях і часткова вывозяцца саюзнымі організацыямі, якія не астаўляюць ніякіх даных аб праведзеных работах, што не дае магчымасьці падагуліць вынікі праводзімых досьледаў і паскорыць вывучэньне гэолёгічнай будовы тэрыторыі БССР, як карысных выкапняў, запасаў і рэжыму вод, маючых вялізарнае значэньне для прамысловасьці, электрабудаўніцтва, комунальнай гаспадаркі і будаўніцтва саўгасаў і колгасаў.

У шэрагу выпадкаў адсутнічае належная ўвязка гэолёга-разьведачных работ з патрабаваньнямі разьвіцьця народнай гаспадаркі тэмпы работ і союзных органаў вывучэньня мінэральных багацьцяў БССР на сёньняшні дзень не забясьпечваюць нават поўнае задавальненьне бягучых патрэб народнае гаспадаркі; асабліва наглядаецца разрыў паміж становішчам гэолёга-разьведачных работ і разьвіцьцём прамысловасьці па вытворчасьці будаўнічых матэр'ялаў.

Улічваючы, што невыстарчальныя тэмпы праводзячыхся на тэрыторыі БССР гэолёга-разьведачных работ у значнай ступені тлумачацца недастатковым асыгнаваньнем для гэтай работы сродкаў—прапанаваць суаднаведным органам уключыць у бюджэт 1932 г. значна большыя сродкі на навукова-дасьледчыя і прамысловыя гэолёга-разьведачныя работы з такім разьлікам, каб гэтыя работы ні ў чым не адставалі ад патрабаваньняў народнае гаспадаркі БССР.

У мэтах увязкі работы ў месячны тэрмін распарадзіцца наладжэньне і разьмяркаваць свае функцыі, выходзячы з пастановы СНК Бел. аб рэорганізацыі БАН і новых задач, ускладаемых на „Беларускае Гэолёга-Разьведачнае Кіраўніцтва.

Сумесна з зацікаўленымі організацыямі—пераглядзець і ўдакладніць пляны працы гэолёга-разьведачных работ на бягучы год і на 1932 г. і распрацаваць пэрспэктыўны плян, устанавіўшы тэрміны і чарговасьць выконваемых і вызначаемых работ, зьвярнуўшы галоўную ўвагу на вывучэньне і падрыхтоўку запасаў для новых будаўнічых матэр'ялаў; у пляне работ вылучыць найбольш ударныя об'екты, забясьпечыўшы іх у першую чаргу неабходным абсталяваньнем, сродкамі і кадрамі.



Пасіліць падрыхтоўку да складаньня другой пяцігодкі

Задача непасрэднага і актычнага ўдзелу гэолёга-разьведачных організацый у складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі і пляну другой пяцігодкі патрабуе самай рашучай перабудовы гэолёга-разьведачнай работы Беларусі.

Стан гэолёга-разьведачных работ у Беларусі, узаемаадносіны між галоўным гэолёга-разьведачным кіраўніцтвам ВСНГ СССР з гэолёга-разьведачным кіраўніцтвам ВСНГБ, з гэолёга-разьведачным інстытутам БАН, поўная адсутнасьць увязкі працы асобных організацый, якія вытвараюць гэолёга-разьведачныя працы,—не забясьпечвае выкананьня вялікіх практычных задач, не забясьпечвае належнага скарыстаньня сродкаў надзвычайна вузкіх кантэрысаў, рацыянальнае скарыстаньне спэцыялістых і рабочых.

Гэтым-жа ў значнай частцы тлумачыцца і тое становішча, што, ня гледзячы на добрую вялікую ў сваіх памерах працу, праведзеную ўсімі організацыямі разам, яшчэ дагэтуль няма больш менш поўнага малюнку прыродных багацьцяў Савецкай Беларусі.

Азнаёміўшыся з працай гэолёгічнага інстытуту БАН, ГРК ВСНГБ відна, што гэтыя організацыі не перабудаваліся на вырашэньне конкрэтных пытаньняў складаньня другой пяцігодкі генэральнага, яшчэ ня сталі штабам вывучэньня нашых багацьцяў, на падставе якіх будзе ў значнай частцы будавацца плян другой пяцігодкі і генпляна электрыфікацыі.

Аб гэтым з усёе відавочнасьцю сьведчыць плян працы інстытуту, які складаўся у канцы 1930 году. У пляне надзвычайна малае месца займае вырашэньне пытаньняў, непасрэдна увязаных з проблемамі складаньня плянаў.

Ад інстытуту БАН мы, адзначаючы даволі каштоўную яго працу, патрабуем яшчэ больш рашучай перабудовы працы.

Адначасова, неабходна дамагчыся ўстанаўленьня неабходных для продукцыйнай, плённай працы умоў, якіх зараз яшчэ ня мае інстытут.

Надзвычайна каштоўныя навуковыя працы інстытуту затрымліваюцца ў выдавецкім аддзеле БАН ад некалькіх месяцаў да году. Выдавецкі аддзел у справе выданьня матар'ялу інстытуту паказаў сваё няўменьне, як трэба кіраваць працай.

Гэолёга-разьведачнае кіраўніцтва ВСНГБ, як аб гэтым зусім яскрава гавораць і кіраўнікі яе, таксама робіць надзвычайна мала ў напрамку распрацоўкі матар'ялаў па складаньню другой пяцігодкі і генэральнага.

Оргкамітэтам Дзяржпляну па складаньню другой пяцігодкі быў вызначаны месячны тэрмін (да першага жніўня) выкананьня заданьня сыстэматызацыі маючыхся літаратурных і іншых матар'ялаў па гэолёгічнаму вывучэньню Беларусі. Ужо зараз можна з упэўненасьцю сказаць, што заданьне оргкамітэту ў тэрмін выканана ня будзе. Кіраўнікі ГРК ня прымаюць ніякіх дзейных захадаў для паскораньня гэтае працы.

ГРК ВСНГБ так ама павінен перабудаваць сваю працу па выкананьню конкрэтных задач складаньня пэрспэктыўнага пляну, бо зараз робіцца значна менш таго, што можна зрабіць нават у тых умовах, у якіх працуе ГРК, улічваючы і адсутнасьць патрэбнага складу працаўнікоў.

Неабходна ў самым тэрміновым парадку рэалізаваць пастанову ЦКК НК РСІ аб організацыі цэнтральнага кіраўніцтва гэолёга-разьведачных работ.

Ня гледзячы на тое, што ўжо прайшоў месяц са дня вынясеньня пастановы—ніводная організацыя нічога практычнага не зрабіла для яе ажыцьцяўленьня.

Непасрэдны ўдзел гэолёга-разьведвальных організацый у складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі і другой пяцігодкі пастаўлены на парадак дня. Неабходна баявое, хуткае практычнае вырашэньне.

Матар'ялы рэйду брыгад „Чырвонай Зьмены“

ГГРК і Вадаканалбуд злачынна тармозяць пабудо[ву] ЦЭЦ

Галоўным гэолёга-разьведачны[м] кіраўніцтвам СССР і Вадаканалбудам была праведзена значная работа на Беларусі і, у прыватнасьці, [у] Менску. Значная частка матар'ялаў мае непасрэднае датычаньне да пабудовы Менскай цёпла-электрацэнтралі.

Ня гледзячы на аднаразовыя настойлівыя запатрабаваньні аб дасылцы матар'ялаў гэолёга-разьведачнага інстытуту БАН, якому даручана консультацыя пабудовы ЦЭЦ, дагэтуль гэтыя матар'ялы яшчэ не дасланы. Высоўваецца цэлы рад надзвычайна „об'ектыўных“ прычын, а інстытут БАН'у прымушаны ў голым месцы распачынаць працу, „адчыняць ужо адчыненыя Амэрыкі“, затрачваць сродкі на ўжо выкананую працу.

Гэта надзвычайна затрымлівае далейшае разгортваньне пабудовы Менскай ЦЭЦ.

Менская ЦЭЦ—адзін з конкрэтных пунктаў генэральнага.

Гэты прыклад яскравы довад няўменьня гэолёга-разьведачных організацый перабудоўвацца на выкананьне чарговых важнейшых задач.

Матар'ялы ўжо зробленых досьледаў, якія маюць непасрэднае датычаньне да пабудовы ЦЭЦ, павінны ў самым тэрміновым парадку быць сконцэнтраваны ў інстытуце БАН, які консультуе пабудову.

Не дамо злачынна растрачваць дзяржаўныя сродкі.

Дзьве паперкі і 10 тысяч рублёў страт

У кастрычніку 1930 году гэолёга-разьведачны інстытут Беларускай Акадэміі Навук атрымаў ад Белколгасцэнтру адносіну наступнага зьместу:

„Белколгасцэнтр просіць уключыць у плян працы на бягучы год акрамя гідра-гэолёгічных і гэолёгічных вышуканьняў па Рагачова-Жлобінскаму комбінату яшчэ вышуканьне па Ляднянска-Дубровенскаму і Брагінска-Хойніцкаму комбінату. Просьба тэрмінова паведаміць, калі магчыма прыступіць да працы і колькі неабходна сродкаў“.

Інстытут уключыў гэтую працу ў плян. Зараз на выкананьне гэтай працы ўжо затрачана звыш 10 тысяч рублёў.

Інстытут БАН атрымаў другую пісульку, дзе Наркамзем паведамляе, што вышуканьні ў гэтых раёнах не патрэбны.

Гэтыя дзьве паперкі і 10 тысяч страчаных грошай надзвычайна яскравая характарыстыка працы Наркамзему, якой павінны зацікавіцца адпаведныя органы.



З зборніку арытмэтычных практыкаваньняў аддзелу кадраў ВСНГБ

СУСТРЭЦЬ 17 МЮД НОВЫМ КОЛГАСНЫМ ПАПАЎНЕНЬНЕМ

СТАРЫЯ, ПЕРАДАВЫЯ КОЛГАСЫ, БЯРЭЦЕ ШЭФСТВА НАД УНОЎОРГАНІЗУЕМЫМІ

Вясеньняя пасеўная кампанія і сенаўборка ў колгасах далі аднаасобнаму сялянству яшчэ адзін урок пераважнасьці буйнай соцыялістычнай гаспадаркі. 44 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'ядналіся ў колгасы.

Да канца 1932 году паводле пастановы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б павінна быць закончана ў асноўным суцэльная колектывізацыя. Але ў радзе раёнаў у сувязі з уборачнай кампаніяй закінута работа па організацыі новага прыліву.

Нельга заспакойвацца на дасягнутых посьпехах. Недапушчаючы самацёку ў гэтым важнейшым пытаньні, трэба надалей штодзённа змагацца за нарастаньне тэмпаў новага колгаснага прыліву.

Надыходзіць рэволюцыйнае сьвята працоўнай моладзі—МЮД. Менская комсамольская організацыя ў парадку падрыхтоўкі, разам з другімі канкрэтнымі мерапрыемствамі, паставіла задачу сустрэць МЮД організацыяй новых колгасаў.

Гэты пачын Менскай комсамоліі павінен быць падхоплены ўсімі раённымі організацыямі.



Падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай

Мацаваць уноўорганізуемыя колгасы

Правільная організацыя працы, укараненьне зьдзельшчыны, ударныя тэмпы ўборачнай кампаніі ў колгасах Баратынскага сельсавету, Бабруйскага р-ну, выклікалі новую хвалю колгаснага прыліву. За апошні час організавана пяць новых колгасаў, у якія ўвайшло 146 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Сельсавет колектывізаваны на 44 проц., замест 9 проц.—на 1-е мая.

Трэба адзначыць, што раённыя організацыі не паклапаціліся, каб хутчэй замацаваць уноўорганізуемыя колгасы.

Колгас „Чырвоная варатынь“, які організаваўся месяц таму назад, з-за валакіты райземаддзелу, дагэтуль яшчэ не земляўпарадкаваны. З гэтай прычыны зрываецца сваячасавая падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Колгасьнікам гэтага колгасу ня выданы працоўныя кніжкі, бо райколгассаюз іх ня прысылае.

Такое самае становішча ва ўсіх астатніх уноўорганізуемых колгасах: „Вольная праца“, „Першае Мая“.

Райколгассаюз павінен забясьпечыць замацаваньне гэтых колгасаў, з тым, каб яны пасьпяхова правялі ўборку і асеньня-пасеўную кампанію.

Рыг. М.

60 колгасьнікаў—у „Чырвоназьменаўскі“ колгас

ПЛЕШЧАНІЦЫ. У мястэчку організаваўся на днях новы колгас імя „Чырвонай Зьмены“, у які ўступілі ўсе комсамольцы мястэчка і беспартыйная моладзь у ліку 60 чалавек.

Кожны дзень дзесяткі новых членаў папаўняюць колгас.

Колгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі на час уборачнай кампаніі.

Х.

Выгнаць з колгасу клясавых ворагаў

Мазыр. Колгас „Новыя Дудзічы“ організаваўся ў мінулым годзе. Налічваецца ў ім толькі 6 гаспадарак. Прыліву ўвесь час няма. Прычынай гэтаму зьяўляецца тое, што кіраўніцтва колгасам знаходзіцца ў руках клясавых ворагаў. Старшынёю колгасу зьяўляецца сын дзяка—Багуцкі Уладзімер. Яго бацька, які зараз зьяўляецца дзяком Калінкавіцкай царквы, таксама ў колгасе. Усё гэта „сьвятое сямейка“, забраўшыся ў колгас, разбурае яго. Беднякі ў колгас ня прымаюцца.

Трэба выгнаць з колгасу гэтых клясавых ворагаў. Навесьці масавую работу сярод беднякоў-серадзякоў аднаасобнікаў організаваць прыліў у колгас.

Селькор.

СУСТРЭЦЬ ВА ЎЗБРАЕНЬНІ НОВЫ ХЛЕБ

У Саюзхлебе, Белкоопсаюзе і Белхлебжыўсаюзе спадзяюцца на самацёк

Узмацніць організацыю хлебазагатовак

Загатоўчыя апараты „адпачываюць“

Мы падыйшлі да рэальнага ажыцьцяўленьня хлебазагатовак ураджаю 1931 г. У паўднёвых раёнах Беларусі пачалася ўжо ўборка хлеба і праз некалькі дзён мы павінны будзем прыступіць да яго загатоўкі.

Між тым, падрыхтоўчая праца да гэтай найважнейшай політычна-гаспадарчай кампаніі праходзіць незадавальняюча. На раду паказчыкаў маюцца прарывы, пра якія ўжо спачатку загатоўчай кампаніі мы павінны сыгналізаваць каб безадкладна пераключаць нашу працу на баявыя рэйкі для выкананьня пляна ў хлебазагатовак.

Загатоўчы апарат у асобе Саюзхлеба, Белхлебжыўсаюзу і Белкоопсаюзу не праяўляюць патрэбных тэмпаў, якія забясьпечылі-б пасьпяховы пачатак хлебазагатовак.

Гэтыя апараты дагэтуль не раскачаліся. Большасьць адказных працаўнікоў пайшлі ў адпачынак і фактычна належнай падрыхтоўкі да гэтай кампаніі не праводзіцца.

Асабліва „адпачываючая“ кампанія захапіла апарат Белхлебжыўсаюзу, на якога ўскладзена асноўная задача выкананьня хлебазагатоўчага пляну. У апараце застаўся адзін працаўнік, які займаецца толькі загатоўкамі фуражу.

Яшчэ вялікая сьлячка на гэтым фронце і ў нізавых організацыях, ніводзін райсаюзаў (асноўны загатоўшчык у раёне) не прыняў належных мер, каб організаваць хлебазагатоўкі.

Хлебазагатоўкі ўжо надыходзяць. Давалі сыгналы ў гэтай найважнейшай політычна-гаспадарчай кампаніі. Трэба форсаваць падрыхтоўку да сустрэчы новага хлеба. Комсамольская організацыя павінна і на гэтым фронце быць уперадзе. Падрыхтоўка складаў, тары і апарату павінна заняць асноўнае месца ў падрыхтоўчай працы.

Ал. Красоўскі.

Наш падарунак

Агульны сход колгасьнікаў колгасу „Авангард“ Уладзімірскага сельсавету (Клічаўскі р-н) пасьля абгаварэньня пытаньня аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў хлебам, пастанавілі ў падарунак рабочым паслаць 16 цэнт. хлеба мінулага ўраджаю.

Хлеб чырвоным обозам прывезен на станцыю і адаслан у горад.

Багрышэвіч.

Пасіліць тэмпы колектывізацыі

Тураў. Ударная падрыхтоўка да правядзеньня уборачнай кампаніі колгасамі раёну выклікала новы прыліў у колгасы. Аднаасобнікі колектыўна падаюць заявы ў колгас.

У колгас імя Варашылава (в. Хачэнь) 13 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі колектыўную заяву аб уступленьні. У раёне за апошнюю дэкаду уступіла 106 гаспадарак у колгас. Організавана 4 новыя колгасы.

Прот. Зах.


Далі адпор кулакам

Любань. Некалькі раз зрывалі кулакі і падкулачнікі організацыю колгасу ў в. Шапілавічы Рэдкаўскага сельсавету.

Комсамольская ячэйка ў апошні час дала рашучы адпор гэтай кулацкай зграі. Праведзена некалькі сходаў у вёсцы. У выніку організаваўся колгас з 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Брыгада, якая была вылучана на гэтым сходзе, шляхам індывідуальнай апрацоўкі, ўцягнула яшчэ 8 гаспадарак.

Організаваны колгас імя Леніна зараз-жа выступіў на ўборку.

А. Рабы



Чырвоныя абозы старога хлеба сустракаюць новы хлеб

З перадавых позыцый

СУСТРЭЧА ЛЕПШЫХ З ГОРШЫМ

Пастанова ЦК КП(б)Б даводзіцца да кожнага рабочага

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены“, „Комсомольской Правды“ і Белдзяржкіно на Асінторпе.

Выязная брыгада разгарнула працу па давядзеньню пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб торпараспрацоўках да кожнай брыгады, машыны рабочага. Першай прапрацавала гэту пастанову ўдарная комсамольская брыгада.

У адказ на пастанову ЦК КП(б)Б рабочая моладзь уступае ў комсамол.

26-га ліпеня выязной брыгадай організавана сустрэча лепшай ударнай брыгады па выкананьню прамфінпляну з горшай. Выпушчаны 5 нумароў радыё-газэты і 4 насьценгазэты.

Белдзяржкіно скончыла з'ёмку кіно-хронікі, на экран пападуць кадры, якія характарызуюць прычыны, прывёўшыя Асінторп да глыбокага прарыву.

У бліжэйшыя дні рабочыя Асінторпу ўбачаць на экране сваіх „гэрояў“ і „гэрояў“ прарыву на заводзе.

Спажыўцы электроэнэргіі і 1-й Белгрэс — пролетарыі, колгасьнікі і пролетарскае студэнцтва прышлі на дапамогу Асінторпу.

Так, з 22-га па 26-е ліпеня 11-я машына атрымала папаўненьне ў 100 чалавек. Аднак, частка студэнтаў з Віцебскага політэхнікуму ўжо дэзэртыравала.

Рабочыя Асінторпу абураны такім дэзэртырствам і патрабуюць ад партыйных і комсамольскіх організацый, якія непасрэдна пасылалі гэтых людзей на ліквідацыю прарыву, прыняцьця адпаведных мер.

Зараз зноў пагоршылася харчаваньне рабочых. Першая ўдарная катлета, аб якой пісала „ЧЗ“, аказалася апошняй. Звычайная страва ня смачная. У гэтым вінаваты кухарны пэрсанал, абслугоўваючы сталоўку. Ударная мясная катлета павінна зьявіцца штодзённым здабыткам кожнага рабочага тарфяніка.

Міх. Плашчынскі
Г. Палей
Нібыліцкі.

Менск, ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене“
Разьвёрстка комсамольцаў для торпзаводу „Шлях соцыялізму“ ня выконваецца, прыбыла восем комсамольцаў, прымеце меры.

Тураўскі

ДЗЁНЬНІК ЗЬЛЁТУ 3-га ПАКАЛЕНЬНЯ

З залі конфэрэнцыі 2-га Ўсебеларускага зьлёту піонэраў

— У памяшканьні галоўнага корпусу Унівэрсытэцкага гарадка 26 ліпеня адкрылася 2-я конфэрэнцыя зьлёту.

— Конфэрэнцыя абгаварыла даклад ЦК ДКО аб становішчы піонэрорганізацыі і далейшых задачах.

— Тав. Гайдукевіч у пачатку прамовы дае малюнак жыцьця дзяцей у буржуазных краінах, дзе дзеці эксплёатуюцца. У нас з узьняцьцем прамысловасьці і колектывізацыі сельскай гаспадаркі паляпшаецца становішча рабочай клясы і колгасьнікаў, разам з тым і працоўнай дзятвары.

— Піонэрская організацыя да 2-га ўсебеларускага прышла з вялізарнымі дасягненьнямі.

— Няма вучастку соцыялістычнага будаўніцтва, дзе-б піонэры ня ўдзельнічалі з шырокім прыцягненьнем неорганізаванай дзетвары.

— І т. Гайдукевіч дае факты:

— Атрад № 2 г. Віцебску сабраў сярод рабочых 15 рацыяналізатарскіх прапаноў.

— Піонэрская організацыя на вёсцы зьяўляецца ўдарнай брыгадай, верным памочнікам партыі ў соцыялістычнай перабудове с-гаспадаркі.

— Рад атрадаў бязьдзейнічае. У гэтым вінаваты актыў. Мы вінаваты, што жыцьцё некаторай часткі неорганізаванай рабоча-батрацкай, колгаснай і бядняцкай дзетвары не падначалена задачам соцбудаўніцтва. Калі мы гэтую дзетвару прыцягнем да сябе —тады піонэрская організацыя стане шматмільённай. У нас слаба разгортваецца масавая работа. Мы ня ўсе можам ганарыцца дасягненьнямі на фронце політэхнізацыі, усеагульнага навучаньня.

— Перад першым зьездам нас было 80.000. Зараз—200.000.

* Пры ператварэньні піонэр-організацыі ў шматмільённую, нам патрэбна ня голая вярбоўка дзяцей, а штодзённая работа з дзяцьмі. Мы дасягнулі вялікіх посьпехаў, не застанаўліваючыся на гэтым, яшчэ больш узмоцнім свае рады.

* Пад кіраўніцтвам ленінскага комсамолу выканаем задачы пастаўленыя партыяй.

* Абіраецца ганаровы прэзыдыум, у які ўваходзіць т. т.: Косараў, Молатаў, М. Горкі і інш.

* Зачытваецца прывітальная тэлеграма ад ЦБ ЮП УсеЛКСМ.

* Гомельская і Віцебская дэлегацыі на пабудову падводнай лодкі „Піонэр“ сабралі 40 р.—выклікаюць астатнія дэлегацыі.

* Зьлёт колектыўна сьпявае марш Будзёнага.

* Конфэрэнцыя заслухала даклад НКА тав. Акуліка.

* У першым разьдзеле свайго дакладу тав. Акулік дае малюнак



Тав. Палякоў вітае зьлёт

выхаваньня дзетвары ў капіталістычных краінах і ў нас, у Савецкім Саюзе,

Праз школы мы выхоўваем такую моладзь, якая будзе завяршаць соцыялізм

* Інтэрнацыянальнае выхаваньне павінна праходзіць ня толькі пад кутом гледжаньня соцбудаўніцтва, але пад кутом інтарэсаў сусьветнай рэволюцыі.

* Клясавы вораг змагаецца за дзяцей. Ёсьць выпадкі, калі пад уплывам сэктантаў піонэры не наведвалі школьных заняткаў.

* Тав. Косараў сказаў—нараджаецца новы чалавек, яго імя ўдарнік. Вы новыя людзі павінны быць ударнікамі на фронце соцбудаўніцтва нашай краіны.

6-цімесячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці

НЕ УПУСКАЦЬ АСНОЎНАГА ЗЬВЯНА

ў барацьбе за якасьць работы вясковага комсамолу

ПОЛІТМІНІМУМ ПАВІНЕН БЫЦЬ У ТЭРМІН УСВОЕН

Становішча прапрацоўкі політмінімуму па цэламу раду організацый прымушае нас зноў біць трывогу. Як райкомы, так і ячэйкі на мясцох запамяталі аб значэньні гэтага пытаньня, не змаглі зьвязаць правядзеньне работы па росту сваіх радоў і ўдзелу ў гаспадарчым жыцьці з павышэньнем тэорытычнага ўзроўню і ліквідацыяй політняпісьменнасьці комсамольцаў; запамяталі аб рашэньні IX зьезду УсеЛКСМ, аб тым, што „падвышэньне тэорытычнага ўзроўню мас членаў УсеЛКСМ зьяўляецца адной з рашаючых умоў у замацаваньні дасягнутага ў асноўным павароту тварам да гаспадарчага будаўніцтва і ўзьняцьце работы саюзу на больш высокую ступень".

Гэтае пытаньне асабліва зараз павінна з усёй вострасьцю стаць перад кожнай комсамольскай ячэйкай, перад кожным райкомам комсамолу. Мы маем даволі значныя посьпехі ў росьце нашых радоў, але патрэбна зараз ставіць пытаньне аб замацаваньні гэтага росту. Гэтага мы зможам дабіцца, калі кожная ячэйка ўцягне уноўпрынятых у комсамол у актыўную грамадзка-політычную і гаспадарчую работу, калі кожная ячэйка ахопіць усіх уноўпрынятых політвучобай.

Праводзім па ўдарнаму

Пытаньню політмінімуму Лоеўскай організацыі надаецца вялікая ўвага. Організаваныя гурткі па ячэйках працуюць. Разгорнута работа па збору сродак на набыцьцё літаратуры, заключаны соцдагаворы паміж ячэйкамі на лепшае ўсваеньне пытаньняў політмінімуму.

У ліпені месяцы адбыўся пленум райкому комсамолу сумесна з актывам. Гэты пленум з усёй сур'ёзнасьцю абгаварыў пытаньне становішча прахаджэньня політмінімуму і вызначыў рад мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць 100 проц. ахоп комсамольцаў політвучобай.

Яўсеенка.

Прапрацоўка політмінімуму распачалася

ЦЕРАХОЎКА.

Раённая комсамольская організацыя рашуча пераключылася на правядзеньне ў жыцьцё політмінімуму. Напярэдадні заняткаў з мэтай выявіць політычныя веды комсамольцаў, былі праведзены куставыя політбаі, якія паказалі, што вялікая частка комсамольцаў, асабліва вясковых, зусім політычна-няпісьменная.

Гершман

Зьвярнуць увагу

Дудзіцкая комсамольская ячэйка Мазырскі раён, налічвае ў сваіх радох 15 комсамольцаў, але працы ніякай не вядзецца. Політвучоба зусім не праводзіцца, агульных комсамольскіх сходаў ня было на працягу трох месяцаў. Некаторыя комсамольцы п'янствуюць і хуліганяць.

Комсамолка Голад, якая нядаўна прыехала з ШКМ, таксама нічым не дапамагае ячэйцы наладзіць політвучобу і, наогул работу. РК ЛКСМБ таксама не зварочвае на гэтую ячэйку ніякай увагі.

Нікіліч

Аб політвучобе забыліся

У Копыльшчыне політвучоба комсамольскай організацыі на вельмі нізкай ступені. Калі ўзяць паасобныя ячэйкі, як Дубраўскую, Якаўлевіцкую, Амэрыканскую, дык у гэтых ячэйках ня было ніводных заняткаў політгурткоў. У Якаўлевіцкай ячэйцы аб політвучобе нават забыліся. Паасобныя комсамольцы Якаўлевіцкай ячэйкі настолькі політняпісьменныя, што ня ведаюць, які нядаўна адбыўся зьезд комсамолу Беларусі, хто зьяўляецца сакратаром ЦК ЛКСМБ і г. д. Бюро комсамольскай ячэйкі і РК ЛКСМБ зусім не рэагуюць на такое становішча.

Мяжэвіч.

Недапушчальнае становішча

У Брагінскім раёне можна яшчэ і зараз сустрэць такія ячэйкі, якія нічога ня ведаюць аб шасьцімесячніку ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу.

РК ЛКСМБ нічога не зрабіў па гэтаму пытаньню. Політгурткі ня існуюць пры ячэйках. На бюро колгаснай ячэйкі м. Брагіна некаль кі разоў ставілася пытаньне аб організацыі політгуртка, але пастанова засталася ня выкананай.

Раённаму камітэту комсамолу патрэбна больш уважліва сачыць за выкананьнем ячэйкамі пастаноў IX зьезду аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу і прыняць усе захады да зьнішчэньня гэтага прарыву ў рабоце.

Каранчук А.

Адсутнічае дапамога

Н-Даросская ячэйка ЛКСМБ, Стара-Дароскага раёну, яшчэ не пачала ліквідацыі сваёй політняпісьменнасьці. Няма комсамольца, які-б ведаў рашэньні комсамольскіх зьездаў, 6-га зьезду саветаў і г. д.

Вялікая віна ў зрыве політвучобы кладзецца на райком комсамолу, які ніякай дапамогі не аказвае ячэйцы ў гэтым пытаньні.

Н. Гарбуноў.

Я. П. Астрэйка

25-га ліпеня а 8-й гадзіне ўвечары ў лягерах АСОавіяхэму трагічнай сьмерцю памёр толькі скончыўшы курсы комсамольскага актыву тав. Я. П. Астрэйка. Сьмерць вырвала з нашых радоў маладога адданага барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва таварыша.

Тав. Астрэйка зьяўляецца сынам рабочага, старога бальшавіка, які загінуў ў барацьбе за аслабаненьне Беларусі ад белапалякаў. Яму ўсяго было 18 год. З 12-гадовага ўзросту ён пайшоў працаваць на вытворчасьць і ў мінулым годзе быў вылучаны на курсы комсамольскіх працаўнікоў.

Яго адданасьць справе соцыялістычнага будаўніцтва, бальшавіцкая стойкасьць, павінны служыць нам прыкладам.

Група таварышоў.

Прымайце пуцёўку 3-га, кантрольнага

КОМСАМОЛЬСКІ ЭНТУЗІЯЗМ—ШАХТАМ ТАРПЯНОГА ДОНБАСУ

Рэзолюцыя

3-га кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладах Белторпаб'яднаньня і аб выкананьні дырэктыў удзелу ЛКСМБ у вырашэньні тарпяной проблемы

Пленум ЦК ЛКСМБ адзначае наяўную пагрозу зрыву выкананьня плянаў торпаздабычы. На 16-ае ліпеня выканана програма ў адносінах да сэзоннага пляну на 24,8 проц., а каляндарнага пляну—37,1 проц, гэта зн. што прамысловасьці БССР на 16 ліпеня недададзена 250000 тысяч тон торпу, што ставіць пагрозу астаноўкі з-за адсутнасьці сваячасовай дастаўкі паліва шэрагу буйных прадпрыемстваў БССР, і не забясьпечвае павялічэньне ўдзельнай ўвагі ў паліўным балянсе БССР з 13,3 у 1930 г. да 79 проц. у 1933 г.

Работы гаспадарчых, профсаюзных і комсамольскіх організацый на перабудаваны ў суадпаведнасьці з выкананьнем плянавых заданьняў торпаздабычы. Комсамольскія організацыі не мобілізавалі сваю ўвагу на няўхільнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК ЛКСМБ аб падрыхтоўцы і правядзеньні торпсэзону, нявыкарастан урок невыкананьня торпппляну 1930 г. асабліва у раёнах: Клічаўскі. Быхаўскі, Смалявіцкі, што пленум ЦК расцэньвае як праяўленьне правага ўхілу на практыцы у кіраўніцтве комсамольскіх організацый гэтых раёнаў. Не пастаўлена на службу выкананьня торпфінпляну культурна-масавая работа сярод моладзі (моладзь складае 60-70 проц.)

Найлепшыя соцыялістычныя формы працы, як соцспаборніцтва і ўдарніцтва не сталі набыткам большасьці торфарабочых організацый заводаў, таму масца зусім нізкая вытворчасьць працы: адней брыгады 62,2 проц, а вытворчасьці працы адзінага рабочага 65,2 проц.

Не выканана райкомамі мобілізацыя „1000" комсамольцаў на торпазаводы (выканана 298 чал.) Пацьвердзіць пастанову Бюро ЦК аб прынятых мерах пра зьняцьце з работы сакратароў Койданаўскага, Смалявіцкага, нам. сакратара Клімавіцкага РК ЛКСМБ.

Пленум ЦК ЛКСМБ пастанаўляе

1. Работа комсамолу Беларусі павінна выходзіць з таго, каб „забясьпечыць на працягу 3-х год такое разгортваньне здабычы торпу, якое-б забясьпечыла як мінімум перавод у гэты тэрмін усёй прамысловасьці, выпрацоўку электроэнэргіі і асноўных культурна-бытавых установаў, прамысловых цэнтраў на тарпяны апал" (з пастановы ЦК КП(б)Б).

Пленум ЦК зьвяртае ўвагу ўсёй організацыі ЛКСМБ на баявое пераключэньне ўсёй работы па ліквідацыі ствараўшагася прарыву ў здабычы торпу сэзону 31 г. і абавязвае, асабліва Менскі, Віцебскі, Гомельскі гаркамолы, Магілеўскі, Барысаўскі, Клімавіцкі, Полацкі, Шклоўскі, Рэчыцкі, Быхаўскі, Бабруйскі, Чашніцкі, Аршанскі, Церахоўскі, Асіпавіцкі райкамолы забясьпечыць выкананьне плянаў здабычы торпу і ліквідацыю пагрозы забясьпечаньня апалам галоўных прадпрыемстваў БССР шляхам:

а) Дапамогі заводам у організацыі вярбоўкі рабсілы, змагаючыся з цякучасьцю рабсілы на торпазаводах праведучы соцыялістычную контрактацыю сярод рабочай моладзі і рабочых на працу да канца пяцігодкі.

б) Пастаноўкі правільнай тарыфікацыі сярод рабочых тарпянікаў з такім разьлікам, каб забясьпечыць падвышэньне кваліфікацыі рабочых і прасоўваньне па кваліфікацыях рабочай моладзі. Да сэзону 1932 г. давесьці сталае асяродзьдзе комсамольцаў на торпазаводах ня менш 6.000 чал.

в) Правільнай расстаноўкі рабсілы і організацыі працы на торпазаводах, зьнішчыўшы прастоі, нерацыянальнае скарыстаньне машын і г. д.

2. Прапанаваць гаркомам, райкомам і ячэйкам ЛКСМБ на тэрыторыі якіх знаходзяцца торпараспрацоўкі, разгарнуць шырокую масавую работу сярод рабочых і рабочай моладзі.

Паставіць задачу перад кожнай ячэйкай ЛКСМБ торпазаводу дабіцца організацыі ня менш, як адной маладзёжнай брыгады на заводзе, забясьпечыўшы такія тэмпы работы гэтых брыгад, якія-б выконвалі штодзённа пляны торпаздабычы і зьяўляліся ўзорнымі паказчыкамі для ўсіх рабочых торпазаводу.

Весьці рашучую барацьбу з ілжэўдарніцтвам, рвацтвам, прагульшчыкамі, скарыстоўваючы для гэтага маючыйся вопыт прамысловых організацый (чорныя дошкі, буксір і г. д.), шырока популярызуючы вопыт гэроічнай барацьбы брыгад Кавэрды, Маслава, Шаўкінова і інш. за выкананьне торпфінпляну. Комсамольскія організацыі павінны дабіцца сталага вучоту працы ўдарнікаў.

Правесьці шырокую масавую работу разьвіцьця рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і ўнясеньню рабочых прапаноў, вышукваньню і скарыстаньню ўсіх унутраных рэсурсаў, разгарнуўшы сетку плянава-опэрацыйных груп,—гэтым самым забясьпечыць поўнае выкананьне торпфінпляну як у колькасных, так і ў якасных паказчыках.

3. Пленум ЦК адзначае марудныя тэмпы ходу дасьледчых работ і падрыхтоўкі балот для здабычы торпу,—выканана на 16—VII-31 г. 25 пр. плянавага заданьня, што зьяўляецца пагрозай для далейшага разгортваньня працы тарпяной прамысловасьці.

Пленум ЦК абавязвае комсамольскія організацыі і ў асаблівасьці Полацкага, Віцебскага, Высачанскага, Бялыніцкага, Бабруйскага, Слуцкага, Грэскага, Сьвіслацкага, Церахаўскага, Веткаўскага, Мазырскага, Петрыкаўскага, Капаткевіцкага, Расьнянскага раёнаў забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольскіх організацый і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці ў дапамозе правядзеньню вышукальных работ і падрыхтоўкі балот для тарпяных распрацовак.

4. Яўна нездавальняючае становішча падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для тарпяной прамысловасьці (маецца 2 школы ФЗВ з ахопам у 31 г. 464 ч. тэхнікум—60 чал. і аддзяленьне пры Горацкай Акадэміі з ахопам 65 чал., якое аб'ядноўваецца ў тарпяны інстытут з дадатковым наборам у 100 чал.), ні ў якім разе ня можа здаволіць запатрабаваньня шпарка разгортваючагася тарпяной прамысловасьці.

Пленум ЦК ставіць пытаньне аб неабходнасьці шпаркага разьвіцьця падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для торпапрамысловасьці праз ФЗВ. Пленум лічыць, што у бліжэйшы час павінна быць пашырана сетка ФЗВ тарпянікаў да 7-8 школ, організуемыя коротка-тэрміновыя курсы з ахопам на 40 проц. моладзьдзю.

5. Пленум ЦК зьвяртае ўвагу Беларусі на карэннае палепшэньне механізаваных спосабаў здабычы торпу ў плянах 1932 г. (фрэзэрны, гідраэлеватарны). Адначасова прапануе комсамольскім організацыям узяць пад непасрэдны нагляд здабычу торпу механізаваным спосабам і абавязвае комсамольскія організацыі Магілёўскай фабрыкі штучнага валакна, Белдрэсу, Гомельскага шклозаводу, Добрушскай папяровай ф-кі, Барысаўскай электростанцыі, Бабруйскай электрастанцыі, Менскага Эльводу забясьпечыць перавод гэтых прадпрыемстваў на апал фрэзэрным торпам. На ўсіх торпазаводах дабіцца рацыянальнага і правільнага скарыстаньня ўсіх машын і абсталяваньня, ліквідаваўшы абязьлічку ва ўсіх процэсах вытворчасьці тарпяной прамысловасьці.

6. Пленум ЦК прапануе комсамольскім організацыям дабіцца карэннага пералому ў правядзеньні культмасавай работы сярод рабочай моладзі асабліва сярод моладзі, прышоўшай з вёскі.

7. Пленум ЦК ухваляе пастанову Бюро ЦК аб мобілізацыі другой тысячы комсамольцаў на торпараспрацоўкі і прапануе ГК, РК і ячэйкам забясьпечыць баявое правядзеньне мобілізацыі другой тысячы і скончыць мобілізацыю першай тысячы у тэрмін да 25 ліпеня 1931 г.

8. Адзначаючы вялікую ролю газеты „Чырвоная Зьмена" ў справе мобілізацыі комсамольскіх мас і працоўнай моладзі на вырашэньне тарпяной проблемы, пленум ЦК і надалей абавязвае рэдакцыю „Чырвонай Зьмены" і „Юнгер Арбайтэр" не паслабляць барацьбу за торп, энэргетыку. „Чырвоная Зьмена" павінна ў далейшым не паслабляць узятых тэмпаў барацьбы за торп, мобілізуючы грамадзкасьць і у першую чаргу комсамольскія організацыі вакол выкананьня і перавыкананьня пляну торпаздабычы.

9. Пленум ЦК адзначае нездавальняючае кіраўніцтва ГК, РК і ячэек і пастаноўку работы комсамола на торпараспрацоўках, прапануе бюро ЦК мобілізаваць 23 актывістых-комсамольцаў для умацаваньня комсамольскай работы на торпазаводах і забясьпечыць опэрацыйнае кіраўніцтва праверкі выкананьня гэтай пастановы, прымаючы жорсткія меры да тых, хто недацэньвае політычнай важнасьці ператварэньня Беларусі ў тарпяны Донбас.

ПАСТАНОВА

Сэкратарыяту Менгаркому ЛКСМБ ад 25-га ліпеня 31 г.

аб правядзеньні ўдарнага дня давядзеньня пастаноў другога Усебеларускага зьезду рабселькораў да кожнага маладога рабочага

1. Надаючы выключна важнае політычнае значэньне пытаньню прапрацоўкі і ўдзелу комсамольскай організацыі ў рэалізацыі пастаноў другога Усебеларускага зьезду рабселькораў —Менскі гарком комсамолу сумесна з рэдакцыяй „Чырвоная Зьмена" абвяшчае 3-5 жніўня гэтага году ўдарнымі днямі прапрацоўкі пастаноў дадзенага зьезду.

2. Гарком ЛКСМБ зварачвае ўвагу ўсёй організацыі на неабходнасьць увязкі прапрацоўкі пастаноў зьезду рабселькораў чарговымі задачамі колектыву у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, паляпшэньне якасьці, шэфства над вёскай, за шматмільённы комсамол, за актыўны ўдзел у нацкультбудаўніцтве, — вызначаных плянам Менгаркому ў падрыхтоўку да XVII МЮД'у.

3. Прапанаваць усім колектывам, ячэйкам ЛКСМБ зараз-жа распачаць падрыхтоўку да правядзеньня гэтага мерапрыемства з тым, каб забясьпечыць масавы ўдзел у прапрацоўкі рашэньняў зьезду ня толькі комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, але і дарослых рабочых, забясьпечыўшы належныя ўмовы для больш сталай прапрацоўкі даных матар'ялаў.

4. Зацьвердзіць прапанованы культпропам сьпіс дакладчыкаў па правядзеньню ўдарнага дня прапрацоўкі рашэньняў. Абавязаць культпроп організаваць для дакладчыкаў консультацыю для падрыхтоўкі для дакладу у наступных днях: 29-30-31 ліпеня і 1-2 жніўня.

Загадчык орг.-інструктарскага сэктару Менгаркому ЛКСМБ

Канопік.

СЬПІС

дакладчыкаў, вылучаных гаркомам ЛКСМБ для правядзеньня ўдарнага дня прапрацоўкі рашэньняў другога Усебеларускага зьезду рабселькораў

Іткін („Чырвоная Зьмена"), Гурвіч (гарком комсамолу). Фрыд (Беларуская акадэмія навук), Фрумкіна (гарком комсамолу), Гімпелеў (дом навукі і тэхнікі) Натарэвіч (дом навукі і тэхнікі), Маслянскі („Беларуска"), Хобат („Комуварка"), Ліакумовіч („Чырвоная Зорка"(. Фрыдман (гарКК). Тэйтэльман (ЦК ЛКСМБ) Мэльцэр (друкарня Сталіна) Шульман (друкарня Сталіна), Новікаў (Індустрыяльна-пэдагогічны тэхнікум). Палей („Комунар") Эстэркін, Кроль, Левін (Варашылава) Гурвіч (Менбудрэст) Баброва (Скорняжная фабрыка). Рашрэй („Ударнік") Язьмір (ф-ка Крупскай) Бродзкі (Белдзярж. кіно), Іваноў, (Бел. трам.), Стэльмах (Бел. трам), Палей (полпрэдства „Комсамольскай праўды) Пузікаў („Чырвоная Зьмена"), Шмаін („Юнгер Арбайтэр") Садоўскі (рэдакцыя „Рабочий"). Анісаў, Лукашук, Казлоў, Давыдава, Фіякін. Усьмінскі, Хомчэнка (рэдакцыя „Чырвонай Зьмены") Шыдлоўскі, Харытановіч („Чырвоная Зьмена", Гутэрман („Беларуска"), Грышалевіч (чыгунка), Мінкін (завод „Бальшавік"), Баскабойнікаў (гарком комсамолу).

Паведамленьне

28-га ліпеня 1931 г. пачынаюць працаваць курсы пропогандыстых РК пры ЦК ЛКСМБ.

Выкліканыя таварышы павінны тэрмінова зьявіцца.

Загадчык ОПТУ ЦК ЛКСМБ

Пэрліна.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

у памяшканьні рэдакцыі а 7-й гадзіне ўвечары

28-га ліпеня, а 7-й гадзіне ўвечары ў рэдакцыі праводзіцца гутарка сэкратароў і экономработнікаў, колектываў і ячэек ЛКСМБ усіх будорганізацый аб удзеле ячэек у правядзеньні нарады комсамольскага актыву, спэцыялістых, рабочых будаўнікоў і др. Рэд. „ЧЗ"

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599